**СВЯТА**

# У ГОНАР ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ





Дзень Перамогі... Для беларусаў гэта свята ўсіх свят. Штогод дзявятага мая ў абласных гарадах, раённых цэнтрах і пасёлках нашай краіны тысячы людзей выходзяць на плошчы, каб аддаць даніну памяці тым, хто змагаўся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх атрадах, падполлі. І на гэты раз традыцыйнае святочнае шэсце, прымеркаванае да Дня Перамогі, у Віцебску пачынаецца з плошчы Леніна. Тут збіраюцца тысячы віцябчан, каб калонай прайсці па цэнтральнай вуліцы горада да манумента воінам-вызваліцелям.

Гучаць песні ваенных гадоў. Па вуліцы Леніна ідуць прадстаўнікі органаў улады і духавенства, грамадскіх арганізацый і прадпрыемстваў, культурных і навучальных устаноў, сярод якіх і ВДУ імя П.М. Машэрава, удзельнікі рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае». Накіроўваюцца яны да плошчы Перамогі, каб павітаць галоўных герояў свята – ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якіх, на жаль, з кожным годам становіцца ўсё менш і менш, а таксама каб успомніць тых, хто не вярнуўся з поля бою.

Шчырыя, пранікнёныя віншавальныя словы старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая Мікалаевіча Шарснёва з нагоды Дня Перамогі гучаць над плошчай. Не могуць стрымаць слёз выбеленыя сівізной франтавікі, блакаднікі, вязні нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў. Яны ведаюць, што такое ваеннае ліхалецце, голад, холад, здзекі, як і памятаюць пра тых, хто змагаўся побач, набліжаючы светлы дзень Перамогі, і загінуў.

З цяжкасцю падымаюцца са сваіх месцаў ветэраны, сур'ёзнымі становяцца твары ў прысутных. Метраном напружана адлічвае секунды. Хвіліна маўчання. Ушанаванне памяці тых, каго няма разам з намі...

У неба падымаюцца паветраныя шары з прымацаванымі да іх папяровымі жураўлямі, на якіх напісаны імёны герояў-вызваліцеляў. Іх запускаюць актывісты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі пад песню «Журавли».

Пасля афіцыйна-ўрачыстай часткі святкавання Дня Перамогі мерапрыемства працягваюць барабаншчыкі Віцебскага кадэцкага вучылішча. Перад тысячамі гараджан праходзяць воіны сіл спецыяльных прызначэнняў, унутраных войскаў, Віцебскага гарнізона, падраздзялення УУС Віцебскага аблвыканкама, ваеннаслужачыя 103-й асобнай гвардзейскай паветранадэсантнай брыгады. Завяршаецца мітынг выступленнем прадстаўнікоў Віцебскага аэраклуба імя А.К. Гараўца.

Але на гэтым святкаванне Дня Перамогі не заканчваецца. На працягу дня на шматлікіх канцэртных пляцоўках горада ладзяцца святочныя мерапрыемствы: выступаюць творчыя калектывы культурных і навучальных устаноў Віцебска, у тым ліку і нашай ВНУ, духавыя аркестры, праходзяць спартыўныя спаборніцтвы. Віцябчане наведваюць тэматычныя выставы, удзельнічаюць у патрыятычных акцыях.

Увечары свята завяршаецца прыгожым салютам.

**НАШ КАР.**



**На здымках:** *(уверсе злева направа)* калектыў нашага ўніверсітэта разам з рэктарам А.У. Ягоравым; ветэраны Вялікай Айчыннай вайны; *(унізе)* студэнты-машэраўцы, якія навучаюцца на ваеннай кафедры.

**Фота Ф. ГРЫНЕЎСКАГА і В. ЛУЗГІНОЙ.**